Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

*Зборнік навуковых прац*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2015

УДК 001–021.121
ББК 72
А437

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Рэдкалегія:
доктар педагагічных навук, прафесар *Г. В. Торхава* (адк. рэд.);
доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар *І. С. Ташлыкоў;*
доктар філалагічных навук, прафесар *В. Д. Старычонак;*
доктар псіхалагічных навук, дацэнт *А. П. Лабанаў*

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук, прафесар *А. А. Гіруцкі;*
доктар біялагічных навук, прафесар *В. М. Нікандраў;*
доктар гістарычных навук, прафесар *Г. А. Космач;*
доктар педагагічных навук, прафесар *І. І. Цыркун;*
доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар *М. Г. Ясавееў*

**Актуальныя** пытанні сучаснай навукі : зб. навук. прац / рэдкал. :
А437 Г. В. Торхава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2015. – 332 с.
ISBN 978-985-541-213-8.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы, прысвечаныя даследаванням у галіне грамадскіх навук, педагогікі, псіхалогіі, філалогіі, фізікі і прыродазнаўства.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам ВНУ, усім, хто цікавіцца надзённымі пытаннямі сучаснай навукі.

**УДК 001–021.121**
**ББК 72**

**ISBN 978-985-541-213-8**

© БДПУ, 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

42



# АДВАКАТУРА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1883–1914 гг.): АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ КАДРАВАГА СКЛАДУ

*І. Г. Гушчынскі*

Адным з найважнейшых элементаў расійскай судовай рэформы 1864 г. стала ўвядзенне адвакатуры – прысяжных павераных. У Беларусі яны з'явіліся значна пазней – у 1883 г., калі былі адкрыты Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі, Гродзенскі, Віленскі акруговыя суды, а таксама Віленская судовая палата. Адзначым, калі ва ўнутраных губернях імперыі інстытут адвакатуры ў адпаведнасці з судовай рэформай 1864 г. фактычна ўпершыню ствараўся, то на тэрыторыі Беларусі ён узнаўляўся, бо ўжо функцыянаваў тут да скасавання ў 1831 і 1840 г. дзеяння Статута ВКЛ.

Прыём у прысяжныя павераныя павінен быў здзяйсняцца спецыяльнымі карпаратыўнымі супольнасцямі адвакацкага самакіравання – саветамі прысяжных павераных, якія ствараліся пры судовых палатах. Першапачаткова ў якасці выключэння ў акругах судовых палат, дзе па нейкіх прычынах не былі яшчэ створаны саветы прысяжных павераных, іх функцыі ўскладаліся на акруговыя суды. Аднак закон ад 5 снежня 1874 г. забараняў адкрыццё новых саветаў прысяжных павераных. Такім чынам, улічваючы, што судовыя палаты ствараліся ў заходніх губернях ужо пасля выдання гэтага закона, у Гродзенскай, Віленскай, Мінскай губернях (адносіліся да Віленскай судовай палаты), а таксама Магілёўскай (уваходзіла ў склад Кіеўскай судовай палаты) функцыі фарміравання асабовага складу адвакатуры і кантролю за іх дзейнасцю выконвалі акруговыя суды. У той жа час карпаратыўнае ўладкаванне адвакатуры распаўсюджвалася на Віцебскі акруговы суд, бо той уваходзіў у склад Санкт-Пецярбургскай судовай палаты [1, с. 360].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Узровень патрабаванняў да жадаючых займацца адвакацкай дзейнасцю для рэалій таго часу быў даволі высокі, у сувязі з чым назіраўся недахоп прысяжных паверанных. Гэта прывяло да таго, што масавы характар набыло аказанне за пэўную плату юрыдычных паслуг (складанне судовых скарг, іскавых прашэнняў і г. д.) асобамі, якія не былі адвакатамі альбо ўвогуле не мелі на гэта права. Такая з'ява атрымала назву тайнай (падпольнай, вулічнай) адвакатуры. З мэтай легалізаваць дадзеную дзейнасць і паставіць яе пад кантроль 25 мая 1874 г. урадам былі выдадзены «Правила о лицах, имеющих право быть поверенными по судебным делам». Паводле іх, акрамя прысяжных паверанных у якасці адвакатаў у судах маглі выступаць іншыя асобы, якія мелі пасведчанні на права «хадайнічаць па чужых справах» (так званыя прыватныя паверанныя). Такія пасведчанні выдаваліся як агульнымі судовымі ўстановамі (судовымі палатамі і акруговымі судамі), так і міравымі суддзямі. Прыватныя паверанныя, у адрозненне ад прысяжных, маглі весці справы толькі ў той судовай установе, у якой яны гэта права атрымалі. У адпаведнасці з гэтым жа законам у міравых судах у якасці паверанных маглі выступаць таксама асобы, якія не мелі згаданых вышэй пасведчанняў, але не больш як па трох справах на працягу года ў межах адной міравой акругі.

Як ужо было сказана, пасады прысяжных паверанных на тэрыторыі Беларусі ўводзіліся разам з адкрыццём тут акруговых судоў – напрыканцы 1883 г. Гэтаму папярэднічала правядзенне комплексу падрыхтоўчых мерпрыемстваў. Так, яшчэ 4 студзеня 1883 г. было абвешчана аб стварэнні «Асобага камітэта для прыняцця і разгляду прашэнняў асоб, якія жадаюць паступіць у прысяжныя паверанныя акругі Мінскага акруговага суда». У склад гэтага камітэта ўвайшлі: старшыня Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда М. К. Мышанкоў, таварыш старшыні палаты Е. Е. Новікаў, а таксама Мінскі губернскі пракурор Г. Г. Гогель [10, арк. 16]. Падобныя камітэты былі створаны і пры іншых акруговых судах краю.

На тэрыторыі заходніх губерняў кадравы склад прысяжнай адвакатуры значна адрозніваўся ад іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі: у першую чаргу колькаснай перавагай прадстаўнікоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каталіцкага веравызнання, а таксама пастаяннай наяўнасцю яўрэяў [2, дадатак Д]. Як вядома, улада з падазрэннем адносілася да дадзеных катэгорый насельніцтва. У сувязі з гэтым функцыянаванне адвакатуры тут у значнай ступені абумоўліваў палітычны фактар [11, с. 96]. Гэта праяўлялася і пры фарміраванні яе асабовага складу.

У выніку дыскрымінацыйнай палітыкі расійскага ўрада ў адносінах да яўрэяў, яны не маглі быць прыцягнуты на судовыя пасады, нават самыя ніжэйшыя (напрыклад, пісараў пры міравых суддзях). Быць прысяжнымі паверанымі ім дазвалялася, але і тут іх правы аказаліся значна абмежаваны. У 1889 г. міністр юстыцыі М. А. Манасеін прадаставіў на зацвярджэнне цара даклад, згодна з якім прыняцце ў прысяжную адвакатуру асоб нехрысціянскіх веравызнанняў магло адбыцца толькі з дазволу міністра юстыцыі. Неабходнасць гэтай меры М. А. Манасеін тлумачыў тым, што рускія выцясняліся з адвакатуры яўрэямі, якія сваімі спецыфічнымі прыёмамі парушалі маральную чыстату, якая патрабавалася ад карпарацыі прысяжных паверaных [3, с. 406]. Дадзены даклад быў зацверджаны Аляксандрам III і набыў сілу закона 8 лістапада 1889 г. У выніку прыток іудзеяў у адвакатуру быў фактычна спынены. На гэтых пасадах знаходзіліся толькі тыя яўрэі, якія атрымалі іх да лістапада 1889 г. Гэта пацвярджаецца аналізам канфесійнага складу прысяжных паверaных Мінскага акруговага суда ў 1886–1914 гг. Пасля 1889 г. доўгі час лічба прысяжных паверaных іудзеяў у ім нязменна заставалася роўнай тром. У той жа час на фоне агульнага колькаснага росту прысяжнай адвакатуры доля яўрэяў у яе складзе змяншалася. Так, па Мінскім акруговым судзе адпаведныя лічбы знізіліся за 1891–1902 гг. з 15,8 да 10 % ад прадстаўнікоў усіх веравызнанняў [2, дадатак Д]. Толькі ў выніку пэўнага паслаблення антыяўрэйскай палітыкі ўрада ў 1904–1905 гг., у прыватнасці, абвяшчэння маніфеста ад 12 снежня 1904 г., у якім абяцаўся перагляд абмежавальных законаў для «іншародцаў», колькасць яўрэяў у складзе прысяжнай адвакатуры паступова пачала ўзрастаць. У адпаведнасці з сакрэтным прадпісаннем старшыні Віленскай судовай палаты на імя старшыні Мінскага акруговага суда П. Ф. Купчынскага ад 23 ліста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мочнікаў прысяжных паверaных асоб нехрысціянскіх веравызнанняў у кожным выпадку стаў патрэбны папярэдні дазвол на гэта міністра юстыцыі [9, арк. 165].

Куды больш значнай доля яўрэяў была сярод прыватных паверaных. Па Мінскай судовай акрузе ў 1886–1914 гг. працэнт іудзеяў у іх складзе вагаўся ад 27,2 (1903–1904 гг.) да 72,7 % (1894 г.) [2, дадатак Е]. Але і колькасць адмоў на іх хадайніцтвы набыцця «права хаджэння па чужых справах» была значна большай, чым для іншых. Фармуліроўкі прычын гэтых адмоў маглі быць розныя. Напрыклад, па акрузе Гродзенскага акруговага суда за 1884 г. яны былі наступнага зместу: «знаходзіўся пад наглядам паліцыі», «знаходзіўся пад судом і пакінуты ў падазрэнні», «не прайшоў іспыт на веданне судаводства», «нядаўна пасяліўся ў Гродзенскай губерні і няма магчымасці сабраць інфармацыю аб яго асобе», «не мае ведаў і маралі сумнеўнай», «знаходзіўся пад судом, хаця яго віна і не была даказана» і вельмі абстрактная фармуліроўка «за адсутнасцю звестак аб яго маральных якасцях». Апошняя была вельмі распаўсюджанай і вельмі зручнай для адказу непажаданым асобам, напрыклад, яўрэям. Так, у 1884 г. выключна ім адказвалася ў выдачы пасведчанняў з гэтай фармуліроўкай [5, арк. 14–14 адв.]. Безумоўна, яўрэі лічылі гэта дыскрымінацыяй сваіх правоў. Мелі месца і сур'ёзныя праявы іх абурэння такой сітуацыяй. У снежні 1882 г. была заведзена справа аб спробе замаху яўрэя Хайма Сярэбранага на міравога суддзю Нікольскага ў месцы Лоеў Мазырскага павета. Сваю злобу на пацярпелага Х. Сярэбраны тлумачыў тым, што «суддзя яўрэяў не любіць», «яўрэю нельга ў яго судзіцца», а таксама што пры гэтым суддзі ён не мог атрымаць пасведчання на права хаджэння па чужых справах [4, арк. 16]. Акрамя таго, што на тэрыторыі Беларусі яўрэі значна часцей за іншых атрымоўвалі адмовы на хадайніцтвы мець права займацца адвакацкай дзейнасцю, яны ў пераважнай большасці складалі спіс тых, хто быў пазбаўлены гэтага права і ўжо не мог стаць паверaным у наступным. Сярод апошніх у 1878–1899 гг. відавочна яўрэйскія імёны і прозвішчы мелі 43 з 61 (70,5 %) [8, 2–8 адв.]. Менавіта вялікай колькасцю іудзеяў сярод паверaных краю можна растлумачыць тое, што сярод пазбаўленых права

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«хаджэння па чужых справах» па ўсёй імперыі вельмі значны працэнт складалі павераныя 5-ці заходніх губерняў. У 1878–1899 гг. апошніх было 61 з агульнай колькасці 316 (19,3 %) [8, 2–8 адв.].

Што датычыць прыёму ў адвакатуру каталікоў, то спецыяльна для іх абмежаванняў не ўводзілася. У адваротным выпадку забяспечыць судовыя ўстановы адвакатамі станавілася б практычна немагчымым. У краі адпаведных кандыдатур з ліку праваслаўных было вельмі мала, а прыцягнуць іх з унутраных губерняў было цяжка, бо дэфіцыт адвакацкіх кадраў назіраўся па ўсёй краіне. Як вынік, падаўляючая большасць павераных, як прысяжных, так і прыватных, на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў былі каталікамі [2, дадаткі Д, Е]. У той жа час гэта рабіла фактычна немагчымым стварэнне тут савета прысяжных павераных, нават пасля 1906 г., калі іх адкрыццё ў цэлым у Расійскай імперыі аднавілася.

Як бачым, асаблівасцямі кадравага складу адвакатуры на тэрыторыі Беларусі сталі колькаснае дамінаванне асоб рымска-каталіцкага веравызнання і пастаянная наяўнасць яўрэяў, лічба якіх пры гэтым кантралявалася. Гэта было натуральна звязана са спецыфікай нацыянальна-рэлігійнага і сацыяльнага складу насельніцтва, а таксама палітычнай абстаноўкі ў краі.

***Літаратура***

1. Богданов, И. Об отсутствии законных препятствий для учреждения советов присяжных поверенных в округах Киевской и Виленской судебных палат / И. Богданов // Юридический вестник. – 1889. – Т. 2. – Кн. 2–3. – С. 353–360.

2. Гушчынскі, І. Г. Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864–1914 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. Г. Гушчынскі ; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка. – Мінск, 2011. – 170 л.

3. Кучеров, С. Л. Евреи в русской адвокатуре / С. Л. Кучеров // Книга о русском еврействе: от 1860-х годов до революции 1917 г. – Иерусалим : Гешарим ; М. : Мосты культуры; Минск : ООО МЕТ, 2002. – С. 404–441.

4. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 125. Дело о проверке благонадежности и нравственных качеств лиц, поступивших на службу в судебное ведомство 1890–1892 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 14. Переписка с Министерством юстиции и Виленской судебной палатой о переводе из других городов и назначении приставов и присяжных поверенных 1884 г.

6. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 329. Дело о проверке благонадежности и нравственных качеств лиц, поступивших на службу в судебное ведомство 1904 г.

7. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 349. Дело о проверке благонадежности нравственных и служебных качеств лиц, поступавших на службу в судебные ведомства 1905–1906 гг.

8. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 431. Список лиц, устраненных от права ходатойства по судебным делам с 1875 г. по 1 января 1910 г.

9. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 461. Переписка с Министерством юстиции и Виленской судебной палатой о запрещении исполнять должность помощников присяжных поверенных лицам нехристианского вероисповедания и др. 1911–1913 гг.

10. НГАБ. – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 6. Дело об образовании при Минской палате уголовного и гражданского суда, а затем Минском окружном суде Комитета для принятия и рассмотрения прошений лиц, желающих поступить в присяжные поверенные 1883–1884 гг.

11. Tarkowski, M. The Development of the Legal Profession of the North-Western Provinces of Russian Empire in the Nineteenth and early Twentieth Century / M. Tarkowski // Journal on European History of Law. – 2014. – № 2. – P. 96–102, 503.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ